У.А.СОСНА

# ПЕРАВОД МАНАСТЫРСКІХ СЯЛЯН У СКЛАД ДЗЯРЖАЎНЫХ НА БЕЛАРУСІ Ў 30-х гг. XIX ст.

Манастырскае землеўладанне на тэрыторыі Беларусі склалася яшчэ ў часы Рэчы Паспалітай з падараванняў каралеўскай улады, магнатаў і вышэйшых службовых асоб[1]. Утрыманне манастырскага персаналу, гаспадарча-ліхвярскія аперацыі духавенства, іх памкненні павялічыць царкоўныя даходы ўсім цяжарам клаліся на плечы сялян. У сістэме іх эксплуатацыі пераважала адработачная рэнта, якая выяўляла ў другой палове XVIII ст. устойлівую тэндэнцыю да павелічэння[2]. Ва ўмовах Расійскай імперыі лёс манастырскіх сялян залежаў як ад ходу рэалізацыі ўрадавай секулярызацыйнай праграмы, распачатай яшчэ Пятром I, так і асабліва ад палітычных узаемаадносін царызму з каталіцкай царквой у цэлым і з іх непасрэднымі ўладальнікамі – манастырамі – у прыватнасці.

У 60-х гг. XVIII ст. урад Кацярыны II адабраў у панаваўшай у Расійскай імперыі праваслаўнай царквы населеныя маёнткі. Лагічна было меркаваць, што на далучаных у 1772–1795 гг. тэрыторыях Беларусі будуць перададзены дзяржаве землі і прыгонныя не толькі праваслаўнай, але уніяцкай і асабліва рымска-каталіцкай царквы. Аднак тут канфіскацыя маёнткаў у духавенства абмежавалася тады агульнымі мерамі, што прымяняліся ў адносінах да прыватных уладальнікаў, якія заставаліся за мяжой ці выступілі супраць новай улады. У наказе Кацярыны II губернатарам Пскоўскай і Магілёўскай губерняў ад 28 мая 1772 г. прадпісвалася: "Аб манастырах вы зробіце разгляд: 1) тыя манахі, якія нам не жадаюць прысягаць, а за граніцу пойдуць, пакідаючы манастыры пустымі, тых манастыроў вёскі загадайце ўзяць у казённае кіраванне; 2) тое ж зрабіце з вёскамі тых манастыроў, якія за граніцай; 3) іншых пакіньце пры кіраванні іх маёнткамі да далейшага аб гэтым устанаўлення"[3]. У адносінах апошніх царскі урад прымаў меры да "захавання цэласці", імкнучыся не дапусціць як продажу, так і новага набыцця маёнткаў царквой. Так, 27 лютага 1819 г. спецыяльным указам духавенства папярэджвалася, што ўсе акты набыцця манастырамі і цэрквамі маёнткаў без "Высочайшего соизволения" афармляцца не будуць[4].

Пералом у адносінах царызму да царкоўнай маёмасці ў заходніх губернях стаў наступаць пасля нацыянальна-вызваленчага паўстання 1830–1831 гг. у рамках крокаў, якія рабіў Камітэт па справах заходніх губерняў да палітычнага супакаення краю. Адным з важнейшых напрамкаў урадавай палітыкі стала барацьба супраць уплыву каталіцкай царквы, што змыкалася са шляхецкай апазіцыяй. Урад ішоў па лініі змяншэння колькасці каталіцкага духавенства і падрыву яго эканамічнай базы. Ліквідацыя царквы як буйнога феадала-уласніка ставіла яе ў большую залежнасць ад дзяржаўнай улады. "Ва ўсіх краінах, дзе каталіцкае духавенства пазбавілася велізарных сваіх маёнткаў, – пісаў Мікалаю I віленскі генерал-губернатар Ф.Я.Міркавіч,– яно разам з тым траціла палітычнае значэнне і ўплыў на грамадства"[5]. На Беларусі ўрад яшчэ разлічваў, што перавод царкоўных сялян у казну пазбавіць іх ад рэлігійнага ўплыву каталіцкага духавенства, забяспечыць паступовы пераход у праваслаўе і тым самым узмацніць палітычныя пазіцыі царызму ў краі.

Пры практычным ажыццяўленні гэтага курсу урад аб'ектыўна дзейнічаў у духу палітычнай запіскі магілёўскага губернатара М.М.Мураўёва: "з вялікай асцярожнасцю", "спачатку быццам бы часова пазбавіўшы багацейшыя манастыры і кляштары нерухомых маёнткаў, калі ж з цягам часу з гэтай думкай звыкнуцца, то рашуча адабраць наогул усе духоўныя маёнткі"[6].

4 Кастрычніка 1832 г. выйшла сакрэтнае распараджэнне міністра ўнутраных спраў Дз.М.Блудава да беларускага і літоўскага генерал-губернатараў скласці ведамасці аб усіх фундушавых сялянах, што належалі каталіцкаму духавенству, "без ніякай агалоскі"[7]. Пры V Аддзяленні Імператарскай канцэлярыі ("штабе па сялянскай частцы") пад старшынствам яго начальніка, будучага міністра дзяржаўных маёмасцей П.Дз.Кісялева, былі створаны камітэты па адабранні ў каталіцкага духавенства населеных маёнткаў і ўладкаванні ў заходнім краі быту праваслаўнага духавенства[8]. Да канца 30-х гг. яны сабралі "сакрэтна, без абвяшчэння

намераў", падрабязныя апісанні духоўных маёнткаў па ўсіх губернях. Гэтыя падрыхтоўчыя матэрыялы, дастаўленыя чынамі земскай паліцыі, выявілі цяжкае становішча сялян царкоўных маёнткаў, дзе захоўваліся традыцыі жорсткай эксплуатацыі.

Яшчэ ў 1821 г. ураджэнец Віленскай губерні Ю.Янушэвіч, які працаваў настаўнікам у дваранскіх дамах Беларусі і Літвы, пасля беспаспяховых спробаў трапіць на прыём да цара, выклаў міністру ўнутраных спраў наступнае: "Духавенства, якое павінна было б падаць прыклад набожнасці, дабрачыннасці і чалавекалюбства ў польскіх губернях зусім насупраць гэтаму, можна сказаць, што алтары іх паліты крывёю і слязьмі сялян, што ў залежнасці ад іх знаходзяцца. Амаль няма няшчаснай селяніна, як належачага духавенству". Адзначаючы, што асноўная частка даходаў паступае ў распараджэнне вышэйшага духавенства, у той час як маса святароў жыве ў бядоце, ён прапаноўваў адабраць маёнткі ў царквы і прызначыць духавенству дзяржаўнае жалаванне[9]. Згодна данясенню чыноўнікаў, што абследавалі вялікі (1332 мужчынскага і 1027 жаночага полу душ) маёнтак ліквідаванага за дапамогу паўстанцкім атрадам Картуз-Бярозскага манастыра, "сяляне... знаходзяцца ў вельмі пасрэдным і большай часткай у кепскім становішчы; многія з іх не маюць ні коней, ні валоў"[10]. У ананімным лісце, прадстаўленным 15 ліпеня 1834 г. Мікалаю І, адзначалася: "многія і вельмі многія рымскія папы маюць у сябе прыгонных праваслаўнага веравызнання сялян і абыходзяцца з імі, як інквізітары з ератыкамі"[11]. Мясцовая адміністрацыя атрымлівала даносы на злоўжыванні ксяндзоў ад духоўных асоб праваслаўнай царквы, незадаволеных эканамічнай і палітычнай перавагай каталіцызму ў краі.

Зразумела, царызм не пакінуў без увагі спачуванне і падтрымку рымска-каталіцкімі манастырамі паўстанцкіх дзеянняў. У дакладзе Камітэта па справах заходніх губерняў ад 28 лістапада 1831 г., ухваленым Мікалаем I "для паступовага выканання", прапаноўвалася зменшыць іх колькасць на Беларусі і пакінуць толькі ў гарадах і некаторых мястэчках, а маёнткі наогул ва ўсіх манастыроў адабраць, замяніўшы іх штогадовымі грашовымі выплатамі[12].

19 ліпеня 1832 г. выйшаў указ аб ліквідацыі некамплектных (што не мелі поўнага складу манахаў) рымска-каталіцкіх манастыроў і перадачы іх маёнткаў у склад казённых[13]. Цікава, што ў папярэдніх намётках указа меркавалася гэтыя маёнткі перадаць у агульную масу каталіцкіх, але пасля, пад уплывам думкі, што ў такім выпадку "урад не дасягне галоўнай сваёй мэты", было вырашана перадаць епархіяльнаму начальству толькі капіталы скасаваных манастыроў, а маёнткі з прыгоннымі сялянамі – у казну[14].

Закрыццё манастыроў, што праходзіла пад непасрэдным наглядам Мікалая І, было ажыццёўлена ў верасні 1832 г., а ў хуткім часе складзены вопісы іх маёмасці[15]. Па Віленскай губерні было ліквідавана 40 манастыроў і паступіла ў казённае ведамства 2270 мужчынскага полу душ, па Віцебскай адпаведна 8 і 1509, па Гродзенскай – 31 і 2066, Мінскай – 21 і 2151, Магілёўскай – 21 і 2848. У 1837 г. па Віцебскай губерні дапаўняльна секулярызавалі ў казну 4 маёнткі (2347 рэвізскіх душ), што належалі манахіням-бернардзінкам і магілёўскай семінарыі[16].

У складзе дзяржаўных паманастырскія маёнткі (так іх сталі называць) паступілі ў распараджэнне Дэпартамента дзяржаўных маёмасцей Міністэрства фінансаў, а на месцах, у губернях, – казённых палат. Урад, імкнучыся да павышэння казённых даходаў з гэтых маёнткаў, стараўся прымусіць арандатараў аказваць сялянам дапамогу і зрабіў шэраг распараджэнняў для аблягчэння іх становішча. Так, па маёнтку Шклоўскага манастыра Міністэрства фінансаў дазволіла выдаць у пазыку сялянам хлеб з эканамічных запасаў. Ён пакідаў на аброку невялікія маёнткі, дазволіўшы сялянам кароткачасовыя адлучкі на заработкі. Дэпартамент дзяржмаёмасцей прадпісаў віцебскай і гродзенскай казённым палатам надзяляць дадаткова сялян зямлёй, расчышчанай з-пад лясных зараснікаў[17].

Для кіравання паманастырскімі маёнткамі часова прызначаліся адміністратары, але, паводле прызнання надворнага саветніка Архіпава, камандзіраванага Міністэрствам фінансаў у Гродзенскую губерню, "казённая палата, нават пры самым строгім наглядзе, не ў стане адхіліць злоўжыванні, якія там могуць

быць". Ён даносіў 9 сакавіка 1833 г., "што дваранін Косця, прызначаны адміністратарам у фальварак Кваццеры, без дазволу казённай палаты прадае таемна розны хлеб і авечую воўну і ўтрымлівае за кошт таго маёнтка вялікую колькасць людзей, што складаюць уласных яго слуг"[18].

Віленскі генерал-губернатар М.А.Далгарукаў прапаноўваў адразу ж адмяніць арэндную сістэму і перавесці паманастырскіх сялян на аброчнае становішча, каб "сяляне, якія заставаліся ў распараджэнні ўладальнікаў духоўнага звання", адчулі "невыгоднасць свайго становішча ў параўнанні з першымі"[19]. Міністэрства ж фінансаў, спасылаючыся на нязначнасць, раздробленасць і раскіданасць паманастырскіх маёнткаў, адмовілася ад люстрацыі (апісанне маёнткаў з вызначэннем сялянскіх надзелаў і павіннасцей) і, пакінуўшы павіннасці сялян на вырашэнне губернатара, аддавала іх з 1833 г. у кароткатэрміновую арэнду. Улічаныя даходы прызначаліся на ўтрыманне прытулкаў, вучылішчаў і духавенства скасаваных манастыроў. 15 Верасня 1838 г. ужо Міністэрства дзяржмаёмасцей распарадзілася аддаваць паманастырскія вёскі ў 12-гадовае арэнднае трыманне з умовай правядзення люстрацыі ў рамках агульнай рэформы дзяржаўных маёнткаў[20].

Царскі ўрад паступова рыхтаваў зліццё уніяцкай царквы з праваслаўнай, што было завершана Полацкім царкоўным саборам 1839 г. У 1828 і 1835 гг. быў закрыт шэраг манастыроў уніяцкага ордэна базыльянаў, але маёнткі іх, што належалі арэндаванню на ўзор казённых, прыпісваліся да ўніяцкіх прыходскіх цэркваў[21]. Урад праяўляў крайнюю асцярожнасць і пакідаў на некаторы час уніяцкаму духавенству маёнткі. Толькі ў 1833 і 1834 гг., калі ў Віцебскай і Магілёўскай губернях узніклі хваляванні на рэлігійнай глебе, былі адабраны ў рымска-каталіцкага і уніяцкага духавенства пяць маёнткаў і ўстаноўлена казённае кіраванне яшчэ адным у сувязі з пераводам сялян у праваслаўе. Паўніяцкія вёскі, дзе па восьмай рэвізіі (1834 г.) лічыліся 2894 мужчынскага полу душы, аддаваліся ў арэнду, а з 1838 г. праводзілася іх люстрацыя паводле правіл, устаноўленых для маёнткаў, канфіскаваных у паўстанцаў 1830–1831 гг.[22]

Манастырскія сяляне спакойна, з надзеяй на паляпшэнне свайго прававога і маёмаснага стану, пераходзілі ў распараджэнне дзяржавы. Незадавальненне і пратэст выклікалі толькі злоўжыванні старой і новай адміністрацыі і кабальная арэндная сістэма эксплуатацыі казёнай вёскі, што прымянялася на Беларусі да сярэдзіны 40-х гг. XIX ст. Так, летам 1833 г. бунтавалі сяляне, належаўшыя раней чавускаму кармеліцкаму манастыру, што ў Магілёўскай губерні. Яны выступілі супраць перадачы маёнтка ва ўпраўленне памешчыка Сіпайлы, адмовіліся яму падпарадкоўвацца і не выйшлі на работу. Засядацель чавускага суда дакладваў губернатару, што сяляне "робяць змову, каб адміністратару не падпарадкоўвацца і тым пазбавіцца ад яго і ад арэнды, яны хочуць, каб іх пасадзілі на плату і таму адмовіліся прынесці прысягу арандатару". Завадатарам выступлення быў селянін вёскі Любань Сямён Паўлаў[23].

Перавод на аброк меў важнае значэнне для сялян. Яго, да прыкладу, упарта дабіваліся манастырскія прыгонныя маёнтка Свіраны Віленскага павета, уладання віленскіх базыльянаў. Большая частка сялян тут адбывала цяжкія паншчынныя павіннасці, меншая была на аброку. Каб не праваказаць незадавальненне большасці, настаяцель манастыра ў 1835 г. загадаў перавесці ўсіх аброчнікаў на паншчыну, чым выклікаў адкрытае выступленне сялян супраць дваровай адміністрацыі і падтрымаўшай яе мясцовай улады. У чэрвені 1835 г. многія сяляне маёнтка з'явіліся ў Вільню да губернатара, аднак сілай былі адпраўлены на месца жыхарства. Тым не менш яны ўсё лета працягвалі адмаўляцца ад выканання паншчыны. У жніўні земская паліцыя паспрабавала арыштаваць завадатараў, але сяляне, узброіўшыся сякерамі і палкамі, аказалі ёй актыўнае супраціўленне. Тады губернскае праўленне запатрабавала ўвесці ў маёнтак вайсковую каманду. У 1836–1837 гг. хваляванні тут аднавіліся з новай сілай[24]. Але не заўсёды ўмовы пераходу на аброк, дзе гэта аказалася магчымым, задавальнялі сялян, аб чым сведчаць хваляванні ў 1834 г. сялян маёнтка Плоскае, належаўшых магілёўскім місіянерам. Вымушаць іх да грашовага чыншу прыходзілася з дапамогай салдат[25]. Перавод дзяржаўных сялян з пан-

шчыны на аброчнае становішча ("на плату") ажыццявіўся на Беларусі толькі ў другой палове 40-х–пачатку 50-х гг.

У 40-х гг. XIX ст. , пасля таго, як царскі ўрад адмяніў дзеянне Статута Вялікага княства Літоўскага і распаўсюдзіў на заходнія губерні агульнаімперскае заканадаўства, была праведзена секулярызацыя ўсіх астатніх царкоўных маёнткаў.

[1] Гл.: Мараш Я.Н. Ватикан и католическая церковь в Белоруссии (1569–1795). Мн., 1971. С.116,146.

[2] Гл.: Ён жа // Материалы по истории сельского хозяйства и крестьянства СССР. М., 1974. Сб.8. С.152 і наст.

[3] Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1961. Т.3. С.27.

[4] Архіў бібліятэкі імя Ф.Скарыны ў Лондане. Манастыры Мінскай епархіі. №8.

[5] Русский архив. 1890. Кн.1. С.429.

[6] Сборник статей, разъясняющих польское дело по отношению к Западной России. Вильна, 1887. Вып.2. С.306.

[7] Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы ў Вільні. Ф.378, 1832 г., спр.2279, арк.1.

[8] Лебедев Н.А. // Русская старина. 1880. №11. С.630.

[9] Расійскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў у Маскве. Ф. ВУА, спр.761, арк.20–21.

[10] Нацыянальны гістарычны архіў (далей НГА) Беларусі ў Гродне. Ф.31, воп.2, спр.11, арк.7–9, 62–63.

[11] Русская старина. 1897. №11. С.384.

[12] Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1979. Т.4. С.102.

[13] Гл.: Полное собрание законов Российской империи. 2-е собр. Т.7. №5506.

[14] Зинченко А.Л. // Исторические записки. М., 1985. С.103–104.

[15] Сборник исторических материалов, извлеченных из Архива собственной е.и.в. канцелярии. СПб., 1896. Вып.8. С.48.

[16] Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у С.Пецярбургу (далей РДГА). Ф.379, воп.3, спр.1395, арк.61–76; спр.1403, арк.69–76; спр.1415, арк.68–85; спр.1420, арк.3–4; спр.1424, арк.88–102; Ф.384, воп.1, спр.7, арк.21–22.

[17] Там жа. Ф.379, воп.3, спр.1403, арк.84–85; спр.1424, арк.43–54; Ф.384, воп.1, спр.7, арк.74–75.

[18] Там жа. Ф.379, воп.3, спр.1415, арк.21, 48–49.

[19] Чтения в императорском Обществе истории и древностей российских. 1864. Кн.1. Отд.5. С.196.

[20] РДГА. Ф.384, воп.1, спр.888, 890, 923; НГА Беларусі ў Гродне. Ф.31, воп.2, спр.47.

[21] Русская старина. 1870. Кн.1. С.533–534, 548–549; Белоруссия в эпоху феодализма. Т.4. С.122.

[22] Общее обозрение состояния государственных имуществ по губерниям, подведомственным второму департаменту. СПб., 1841. С.4.

[23] Чепко В.В. Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX в. Мн., 1972. С.169.

[24] Неупокоев В.И. // Ученые записки Вильнюсского государственного университета. Сер. обществ. наук. Вильнюс, 1954. Т.1. С.131.

[25] НГА Беларусі ў Мінску. Ф.1430, воп.1, спр.4619 (факт прадастаўлены А.Ф.Самусікам).

*И.А.ЛИТВИНОВСКИЙ*

## УКРЕПЛЕНИЕ ЭЛЕКТРОЭНЕРГЕТИЧЕСКОГО ХОЗЯЙСТВА БЕЛОРУССИИ В ГОДЫ ДОВОЕННЫХ ПЯТИЛЕТОК

В перспективном плане народного хозяйства и культурного строительства в БССР на 1928/29–1932/33 гг. представлена программа строительства и расширения районных, фабрично-заводских, коммунальных и сельских электростанций.

Строительство значительного числа крупных станций развернулось уже с самого начала пятилетки. Большинство из них были теплоэлектроцентралями промышленного типа, предназначенными для обеспечения потребителей не только электрической, но и тепловой энергией. В 1929/30 г. в эксплуатацию были введены две промышленные станции – в Борисове, при спичечной фабрике "Красная Березина", и в Бобруйске, при лесокомбинате. В 1931 г. была пущена новая ТЭЦ при Добрушской бумажной фабрике, а в 1932 г. – ТЭЦ Могилевской фабрики искусственного волокна. В конце пятилетки началось строительство мощной тепловой электростанции в Минске и крупной электроцентрали в Кричеве.

За годы первой пятилетки качественные изменения в производстве электроэнергии выразились в концентрации мощностей на важнейших предприятиях. Это привело к тому, что на конец 1932 г. 80% мощностей всех станций было сосредоточено на 9 крупных для Белорусской ССР (свыше 1000 кВт) энергообъектах, в то время как к началу пятилетки суммарная мощность таких станций составляла около 35%[1].